© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

БАЦЬКАЎШЧЫНА

ОРГАН БЕЛАРУСКАЙ НАЦЫЯНАЛЬНА-ВЫЗВОЛЬНАЙ ДУМКІ

DIE WEISSRUTHENISCHE ZEITUNG „BAĆKAUŠČYNA“ („VATERLAND“)

Herausgeber: Wladimir BORTNIK
Die Administration: (13b) München 15, Schwanthalerstr. 48/II, Rückgebäude

Druck: „LOGOS“, Buchdruckerei u. Verl., G.m.b.H., München 8, Rosenheimer Str. 46 a

Цана паза Нямеччынай: ЗША — 15 цэнтаў, Канада — 15 ц., Ангельшчына — 1 шылінг, Францыя — 20 фр., Бэльгія — 5 фр., Аўстралія — 1 шылінг, Аргентына — 2 пэзо. У іншых краінах раўнавартасьць 15 ам. цэнтаў. Падпіска на год — з разьліку 52 нумароў, на паўгода — 26 нумароў, на 3 месяцы 13 нумароў паводля вышэйшае цаны. Цана лётніцкай поштай у заакіянскія краіны — 30 ам. цэнтаў. — Падвойныя нумары каштуюць падвойна

ГАЗЭТА ВЫХОДЗІЦЬ РАЗ У ТЫДЗЕНЬ — ЦАНА 30 Н. ФЭН.

LE JOURNAL BIELORUSSIEN „LA PATRIE“ | DIE WEISSRUTHENISCHE ZEITUNG „DAS VATERLAND“ | THE WHITERUTHENIAN NEWSPAPER „THE FATHERLAND“

№ 11 (193) | Нядзеля 14 сакавіка 1954 г. | ГОД ВЫДАНЬНЯ 8

Адзін год бяз Сталіна

5 сакавіка мінуў роўна год ад сьмерці найбольш крывавага дыктатара, якога ведае гісторыя, Сталіна. Першая гадавіна ягонае сьмерці была шырака адзначаная ўсей заходняй прэсай, якая з гэтай нагоды старалася зрабіць цэлагодні палітычны білянс ды сьцьвердзіць, ці і ў якой меры спадзяваньні й прароцтвы, высказваныя пасьля сьмерці дыктатара, спраўдзіліся. Гэтая канфрантацыя сытуацыі, якой Захад спадзяваўся і ў якую бадай што моцна верыў, з палажэньнем, якое сяньня сталася запраўднасьцю, зьяўляецца вельмі павучальнай. Яна паказвае, на колькі заходняя палітычная думка знаходзіцца яшчэ ў палоне зманлівых ілюзіяў, шкодных і непрабачальных у палітычнай акцыі. Гэтую палітыку Захаду можна схарактарызаваць коратка, што яна робіць вывады і ўстанаўляе свой кірунак не на падставе рэальных, хоць і няпрыемных фактаў, але базуецца ў васнаўным на набожных зычэньнях і пажаданьнях, хоць-бы яны й ня мелі ніякага рэальнага абаснаваньня. Прыгледзімся тады коратка, чаго Захад спадзяваўся ад гэнай зьмены варты на крэмлёўскім алімпе год таму назад, а перад чым апынуўся сяньня.

Агульным і ў тэй ці іншай меры ўсімі падзяляным на Захадзе спадзяваньнем было, што ізь сьмерцю Сталіна распачнецца ў Савецкім Саюзе эвалюцыя ў кірунку лібэралізацыі й дэмакратызацыі ўнутры і злагаджэньне агрэсыўнага курсу навонкі. Такое перакананьне было на столькі сільным, што ня толькі ў Заходняй Эўропе, але навет і ў Задзіночаных Штатах Амэрыкі, ведамых із сваей антыкамуністычнай станоўчасьці, перамагла тэндэнцыя ня перашкаджаць новым крэмлёўскім верхаводам у перамаганьні выкліканага сьмерцю Сталіна нутранага крызысу ў надзеі, што такая пасыўная пазыцыя Захаду паможа ім навесьці ў сябе парадак па тое, каб цьвёрда стаць на шлях мірнага сужыцьця. У такой рэакцыі на сьмерць Сталіна Захад адназгодна задэманстраваў сваю наіўнасьць, большую, чымся навет у Тэгеране, Ялце й Патсдаме. Тады кіраўнікі заходніх дзяржаваў гаварылі з Саветамі ўсё-ж такі, як з сваімі ваеннымі саюзьнікамі, і калі іхны давер да свайго крэмлёўскага партнэра і быў неабаснаваны, дык у кажным выпадку псыхалягічна зразумелы. Цяпер-жа пасьля таго, калі ўсе запэўненьні й гарантыі Саветаў аказаліся аднэй вялікай кпінай, калі Захад вялізарнымі коштамі й ахвярамі ўжо заплаціў ўсе свае памылкі, ня было абсалютна ніякіх дадзеных, каб бяз дай прычыны, а толькі на падставе факту, што аднаго дыктатара замяніў другі дыктатар ці кліка дыктатараў, рабіць наступную памылку.

Гэтая памылка ў вацэне сытуацыі пасьля сьмерці Сталіна выплывала з хвальшывага і ненатуральна ўпрошчанага разуменьня Захадам істоты бальшавізму. Захад не хацеў зразумець, што бальшавізм зьяўляецца натуральным вынікам гістарычнага працэсу разьвіцьця расейскае імпэрыі й чарговай формай спрадвечнага расейскага імпэрыялізму. Захад разглядаў бальшавізм у вадарванасьці ад гэтых гістарычных працэсаў і за шмат зьвязваў яго з асобай самога Сталіна. І трэба было амаль цэлага году, каб пад уплывам такіх-жа самых актаў савецкай абструкцыі, укаранаванай Бэрлінскай канфэрэнцыяй, гэтая вера Захаду ў новы курс савецкай палітыкі канчальна заламалася. Праўда, Чэрчыль яшчэ й сяньня жыве гэтай верай і хоча ўшчасьлівіць чалавецтва ідыліяй з Савецкім Саюзам, але ягоныя маньяцтвы ўжо мала хто бярэ паважна. Сяньня найвялікшыя навет аптымістыя прыходзяць да перакананьня, што палітыка Савецкага Саюзу, сфармуляваная Ленінам у ягонай формуле аб няўхільнасьці сусьветнай пралетарскай рэвалюцыі, якая зьяўляецца далейшым працягам імпэрыялістычнай палітыкі царскае Расеі, зьяўляецца ў сваей аснове нязьменнай. Вось чаму сяньня заходнія палітыкі й публіцыстыя пачынаюць ужо унікаць у істоту бальшавізму й дашукваццa ягоных жаролаў у гістарычным працэсе разьвіцьця расейскае імпэрыі і ў нацыянальных асаблівасьцях расейскага народу.

Бачым тады, што надзея Захаду на перастаўленьне савецкай агрэсыўнай палітыкі на мірныя рэйкі не апраўдалася й прынесла горкае расчараваньне. Не апраўдалася таксама й ягоная надзея на тое, што пасьля сьмерці Сталіна камуністычны Кітай або зусім адпадзе ад савецкага блёку й зьбліжыцца да Захаду або ягоны дыктатар Мао-Тсэ-Тунг будзе імкнуцца пераняць на сябе сталінскую спадчыну ў кіраваньні камуністычным сьветам. Такія спадзяваньні абгрунтоўваліся тым, што пасьля сьмерці Сталіна Мао-Тсэ-Тунг, адзін з наймацнейшых тэарэтыкаў камунізму, заслугай якога была перамога над Чан-Кай-Шэкам і здабыцьцё для камунізму 450-мільённага Кітаю, аставаўся найвялікшым і бескан-курэнцыйным аўтарытэтам у камуністычным сьвеце. Аказалася, аднак, што чырвоны Кітай і ня думае зрываць з Саветамі, а існуе цэлы рад сымптомаў, што сувязь між Пэкінам і Масквой што раз больш зацясьняецца. Так як Маскве вельмі шмат залежыць на Кітаю, трэба спадзявацца, што на Жэнэўскай канфэрэнцыі, на якой будуць разглядацца непасрэдна зьвязаныя зь Кітаем справы карэйскія й індакітайскія і ў якой будуць прыймаць удзел і прадстаўнікі пэкінскага ўраду, ня гэтыя апошнія будуць ісьці на павадку Молатава, але Молатаў будзе старацца патрапляць у тон усіх кітайскіх дамаганьняў.

Захад спадзяваўся, што пасьля сьмерці Сталіна ў Крэмлі разгарыцца змаганьне за ягоную спадчыну, якое можа захістаць савецкай імпэрыяй і або яе кінуць у вір нутранага хаосу або прывесьці да гэтак спадзяванай дэмакратызацыі.

Жыцьцё паказала, што і ў гэтым Захад моцна пералічыўся. Праўда, нутранае змаганьне на Крэмлі ўзапраўды мела месца і ў выніку яго быў зьліквідаваны Бэрыя з найбліжэйшымі супрацоўнікамі, пасьля чаго былі праведзеныя вялікія чысткі ў першую чаргу ў нацыянальных рэспубліках. Сяньня яшчэ немагчыма цьвердзіць, ці на справе Бэрыі нутраныя церці сярод новага савецкага арэапагу закончыліся, ці будзем яшчэ сьветкамі новых неспадзяванак. Факт аднак астаецца фактам, што дасюлешнія супярэчнасьці ў Крэмлі ў нічым не падважылі й не аслабілі савецкай улады. Выглядае, што Маленкаў умела перамог усе цяжкасьці, і ягонае становішча, як

(Заканчэньне на 2-ой балоне)

З хворай галавы на здаровую

МОЛАТАЎ АБ БЭРЛІНСКАЙ КАНФЭРЭНЦЫІ

Тры заходнія міністры адразу пасьля заканчэньня Бэрлінскай канфэрэнцыі зрабілі перад народамі сваіх дзяржаваў вычэрпваючыя справаздачы з прабегу нарадаў і выказалі свой пагляд на іх бязь ніякага папярэдняга ўзгодніваньня із сваімі ўрадамі. Інакш быў змушаны паступаць Молатаў. Перад тым, чымся заняць афіцыяльнае становішча да канфэрэнцыі, у Маскве мусіў цэлымі днямі радзіць крэмлёўскі арэапаг, каб Молатаў мог заявіць якраз тое, што Саветы ў сяньняшні мамэнт сказаць патрабуюць. Таму Молатаў толькі 4 сакавіка выступіў із справаздачай з канфэрэнцыі, якая закончылася 18 лютага. Патрабавалася роўна два тыдні, каб сфармуляваць становішча Савецкага Саюзу да адбытай канфэрэнцыі.

Даўжэзная прамова Молатава, якая зьмяшчала 7.500 слоў, з многіх мамэнтаў заслугоўвае на ўвагу, бо расшыфроўвае далейшыя ходы савецкай замежнай палітыкі. Напачатку Молатаў заатакаваў Атлянтычны пакт, які зьяўляецца, на ягоную думку, спробай практычнай рэалізацыі прэтэнсіяў ЗША да вядучай ролі ў сьвеце. «Атлянтычны пакт, — гаварыў савецкі міністар — зьбліжаецца да ведамага „Антыкамінтэрнаўскага пакту”, які быў падпісаны ў 1937 годзе Нямеччынай Гітлера, мілітарыстычнай Японіяй і фашыстаўскай Італіяй і ў сваей аснове быў ськіраваны супраць Савецкага Саюзу. Няма ніякай падставы сумлявацца ў тым, што Атлянтычны пакт спаткае той самы лёс, які спаткаў і „Антыкамінтэрнаўскі пакт”.»

Молатаў войстра скрытыкаваў «палітыку сілы» заходніх дзяржаваў, якая прывяла да перагонак збраеньняў. У ходзе такой палітыкі вядуць Задзіночаныя Штаты «ўсякага роду запалохваньне», пагражаючы атамнай бомбай, ня могучы аднак на даўжэйшы час утрымаць ейнага манаполю. Сетка амэрыканскіх абаронных пунктаў, ськіраваных супраць Савецкага Саюзу, ня мае абсалютна нічога супольнага з абаронай. Палітыка сілы прывяла далей да тварэньня г. зв. эўрапэйскай абароннай супольнасьці і адраджэньня нямецкага імпэрыялізму. «З прычыны гэтых плянаў паўсталі скрайна сур'ёзныя цяжкасьці для разьвязаньня пытаньня Нямеччыны». Другім мамэнтам палітыкі сілы зьяўляюцца «дыскрымінуючыя» мерапрыемствы ў галіне сусьветнага рынку для Савецкага Саюзу, народных дэмакрацыяў і Кітайскай Народнай Рэспублікі.

Палітыка сілы прывяла да поўнага фіяско і ў галіне мілітарнай, асабліва ў Карэі, дзе яна не дасягнула мілітарнай перамогі, далей у Індакітаі, хаця там Амэрыка і падтрымлівае каляніяльную палітыку Францыі. Узмацненьне Кітайскай Народнай Рэспублікі грунтоўна зьмяніла палажэньне ў Азіі. Палітыка сілы была ськіраваная ўсім сваім астрыём супраць Кітаю і тут яна пацярпела найбольшую няўдачу. «Другі рэзультат палітыкі сілы прывёў да таго, што, наўсуперак ейным мэтам, у гэтым годзе выдатна зацесьніліся гаспадарскія дачыненьні між Савецкім Саюзам, Кітаем і народнымі дэмакрацыямі». Далей Молатаў заявіў: «Праводжаная пануючымі коламі ЗША і дзяржаваў англа-амэрыканскага блёку палітыка сілы ў канчальным выніку расьцягваецца на ўсю замежную й нутраную палітыку гэтых дзяржаваў, што служыць прыгатаўленьню новай вайны. Такая палітыка ня можа быць будаваная на моцным падтрыманьні народаў».

Молатаў ськінуў усю адказнасьць на заходнія дзяржавы за правал Бэрлінскай канфэрэнцыі ў нямецкім і аўстрыяцкім пытаньні. У Бэрліне зарысаваліся ясна існуючыя розьніцы паглядаў на нямецкую праблему. Але гэта неабазначае, — заявіў ён — што становішча да нямецкага пытаньня ў Францыі зьяўляецца поўнасьцю ідэнтычным із становішчам пануючых колаў у ЗША і Вялікабрытаніі.

Молатаў падчыркнуў, што заходні плян узбраеньня Нямеччыны шляхам уцягненьня яе ў эўрапэйскую абаронную супольнасьць зьяўляецца перашкодай для дасягненьня згоды ў эўрапэйскіх пытаньнях, як і прычынай адкладу мірнага дагавору з Аўстрыяй. Францыя ў выпадку стварэньня эўрапэйскай арміі астанецца адзінай вялікадзяржавай, якая будзе пазбаўленая собскіх нацыянальных збройных сілаў. Такі стан асабліва сьмяротна нарушыць савецка-францускі дагавор з 1944 году. Прынятая парлямантам Заходняе Нямеччыны зьмена канстытуцыі, якая дае ёй права ўводзіць прымусовую вайсковую службу, «дае вольную руку ўраду Адэнаўэра тварыць собскую армію». Нельга сумлявацца, што саюзная рэспубліка пасьля ажыцьцяўленьня дагавору аб ўэрапэйскай абароннай супольнасьці ня будзе трымацца ў рамах абавязваючых яе пастановаў.

Тут перайшоў Молатаў да галоўнага пытаньня, якім зьяўляецца «нямецкі мілітарызм». Ён заявіў: «Калі-б урады Францыі, Вялікабрытаніі і ЗША згадзіліся з савецкім урадам у тым, што аднаўленьне нямецкага мілітарызму (згодна дагавораў у Ялце й Потсдаме) зьяўляецца недапушчальным, гэта істотна аблягчыла-б разьвязаньне іншых спрэчных пытаньняў». Молатаў асьветчыў, што «паніжаючы» Бонскі дагавор пера-

(Заканчэньне на 2-ой балоне)

Пачынаюць нас разумець

Аднэй з найвялікшых памылак у паглядах на Савецкі Саюз на Захадзе было да апошняга часу тое, што гэтая многанацыянальная імпэрыя, штучна зьлепленая зь незалежных у мінуўшчыне народаў, была ідэнтыфікаваная з Расеяй, а ейныя жыхары, сярод якіх больш чымся палавіну становяць нерасейскія народы, з расейскім народам. Людзі на Захадзе, што аналізавалі Савецкі Саюз з розных гледзішчаў і знаходзілі ў ім розныя нутраныя працэсы, не заўважалі ў сувязі з гэтым аднаго найважнейшага мамэнту на звыш аднэй шостай часьці сьвету — нацыянальнага пытаньня нерасейскіх народаў, безь якога нельга зразумець ані самой істоты Савецкага Саюзу, ані тых адцэнтравых нацыянальных сілаў, што зьяўляюцца найбольш чулай ягонай Ахілесавай пятой. Такі пагляд на Савецкі Саюз выдаваўся тым больш дзіўным і недарэчным, што навет афіцыяльны назоў ягоны — Саюз Савецкіх Сацыялістычных Рэспублікаў, значыцца саюз 16-ці незалежных фармальна дзяржаваў, узаконеных савецкай канстытуцыяй, яскрава яму пярэчыў. У разуменьні ня толькі заходніх грамадзянстваў, але навет адказных палітыкаў, публіцыстых ды г. зв. «знатакоў» савецкіх праблемаў Савецкі Саюз быў сынанімам Расеі, а народы Савецкага Саюзу — сынанімам расейскага народу. Гэткае магутнае дзеяньне было расейскай прапаганды на Захадзе!

Зразумела, такі хвальшывы й скрыўлены пагляд на Савецкі Саюз цягнуў за сабой і фатальныя палітычныя памылкі: Захад, шукаючы слабых месцаў савецкай імпэрыі, каб іх выкарыстоўваць у змаганьні з бальшавізмам, ня бачыў месца найслабейшага, якім зьяўляюцца нацыянальныя імкненьні нерасейскіх народаў. Гэтых імкненьняў Захад ня бачыў, і таму, між іншым, у ягоных канцэпцыях будучай перабудовы падсавецкага Ўсходу дагэтуль ня было месца для канцэпцыі найбольш правільнай, найбольш мэтазгоднай і для расейскага імпэрыялізму адзіна сьмяротнай: канцэпцыі распадзелу савецкае імпэрыі на незалежныя дзяржавы нерасейскіх народаў.

Аднак апошнім часам на Захадзе пачынаецца выразная рэвізія такога пагляду. Заходні сьвет пачынае паволі здаваць сабе справу з таго, што бальшавізм — гэта ня нейкае абстрактнае зьявішча, ня інтэрнацыянальны рух, які, дзякуючы простаму прыпадку, — як намагаюцца прадставіць імпэрыялістычныя колы расейскае эміграцыі — знайшоў сваё месца ў Расеі і там перамог, але адна з формаў спрадвечнага расейскага імпэрыялізму. Захад пачынае бачыць, што найбольшы супраціў стаўляць бальшавізму якраз нерасейскія народы і нерасейскія саюзныя рэспублікі і што якраз гэтыя апошнія зьяўляюцца аб'ектам найвастрэйшага ціску, арэнай бесьперапынных чыстак і ахвярамі найбольш жахлівага гэносыдызму, тады, калі нічога падобнага ў такой меры не заўважаецца на тэрыторыях этнаграфічнай Расеі.

У заходняй публіцыстыцы знаходзім што раз часьцей правільныя пагляды на Савецкі Саюз. У ім пачынаюць ужо бачыць ня толькі Расейцаў, але і заўважаць цэлы рад нерасейскіх народаў, і канстатаваць, што антысавецкія настроі сярод апошніх беспараўнаньня сільнейшыя, чымся сярод Расейцаў. Гэтую рэвізію паглядаў распачала амэрыканская публіцыстыка, а за ёй пайшла й заходняэўрапэйская прэса. Нямецкая палітыка, як ведама, ніколі ня была прыязнай да нацыянальных імкненьняў нерасейскіх народаў, а таму і ў нямецкай публіцыстыцы нацыянальныя праблемы падсавецкага Ўсходу не знаходзілі належнага зразуменьня. Але й тут пачынае апошнім часам павольна пранікаць іншы вецер. Час ад часу і на балонах нямецкай прэсы можна знайсьці правільную ацэну таго складанага працэсу, які пэрманэнтна адбываецца ў Савецкім Саюзе і зьяўляецца ў простай прычыновай залежнасьці ад нацыянальных супярэчнасьцяў шматнацыянальнай савецкай імпэрыі. Паказальным у гэтым дачыненьні зьяўляецца перадавы артыкул нямецкага знатака савецкіх праблемаў Імануэля Бірнбаўма, зьмешчаны ў мюнхэнскай «Сюддойчэ Цайтунг» 25 лютага сёлета. Артыкул вельмі цікавы і правільна насьвятляе непераможныя клопаты, якія маюць бальшавікі ў нерасейскіх саюзных рэспубліках. Дзеля прыкладу зацытуем з гэтага артыкулу даўжэйшы ўрывак:

«Амаль штодзённа прыносіць маскоўская і правінцыянальная прэса новыя паведамленьні аб акцыі чыстак і перамяшчэньняў на важных партыйных і ўрадавых становішчах. Такія паведамленьні прыходзяць рэдка з запраўднай Расеі, дзе толькі ў Ленінградзе мела месца больш значная партыйная чыстка; яны паходзяць часьцей з Украіны і Беларусі, з трох балтыйскіх дзяржаваў, з трох каўкаскіх рэспублікаў і зь пяцёх савецкіх туркамоўных дзяржаваў Сярэдняй Азіі.

У расейскай эміграцыйнай прэсе паведамлялася аб ведамай работніцкай апазыцыі ў паасобных савецкіх індустрыяльных цэнтрах. Стварэньне новай вышэйшай касты зь ейнымі большымі правамі й вышэйшымі даходамі адкрыта крытыкуецца ў прафсаюзных колах часьцей, чымся перад гэтым. Такога роду выпадкі здаецца ўзапраўды далі штуршок да чыстак у Ленінградзе. Прамысловае работніцтва Расеі жыве далёка горай, чымся слой вышэйшых ураднікаў, але лепш, чымся масы калгаснага сялянства, не гаворачы аб мільёнах прымусовых работнікаў. У „бесклясавай” дзяржаве Ўсходу хвабрычныя работнікі твораць цяпер свайго роду вялікі сярэдні стан, жыцьцёвыя ўмовы якога на працягу апошніх гадоў значна папраўляюцца. Гэты слой у цэласьці, паводля інфармацыяў уважных абсэрватараў, ані не захопліваецца рэжымам, ані ня выказвае глыбокага ім незадаваленьня, але зьяўляецца больш менш палітычна індэфэрэнтным.

Глыбей карэніцца апазыцыя ў нерасейскіх складовых дзяржавах імпэрыі, дзе ўсьцяж выкрываюцца сьляды „буржуазнага нацыяналізму” антырасейскай ахварбоўкі. Украінцам з нагоды 300-ай гадавіны іхнага задзіночаньня з Расеяй яшчэ раз убіваецца ў галаву, што толькі дзякуючы савецкай палітыцы адбылося задзіночаньне Ўсходняй Галічыны, Закарпацьця, Букавіны й Бесарабіі зь Вялікай Украінай. Сярод туркмэнскіх народаў Казахстану і Узбэкістану заўважаюцца, як нядаўна сьцьвердзілі неаднакратна савецкія прамоўцы, азнакі пантурскіх і панісьлямскіх рухаў, на паўдзённым Каўказе паніранскія імкненьні. Пры гэтым непасрэднае суседзтва гэтых тэрыторыяў, гаспадарскае значэньне якіх усьцяж узрастае, зь дзяржавамі, што прылучыліся да сусьветнага палітычнага антыбальшавіцкага фронту, як Турэччына, Пакістан (а хутка можа і Іран), выклікае ў Маскве вялікае занепакаеньне.

Спасярод высыланых з Масквы ўладароў, заданьнем якіх зьяўляецца мацней зьвязваць з цэнтрам саюзныя рэспублікі, знаходзяцца многія вайсковыя. Ня менш, як 40 маршалаў, генэралаў і адміралаў было „выбраных” апошнім часам у рэгіянальныя партыйныя кіраўніцтвы. Таксама ў сьпіскі кандыдатаў у Вярхоўны Савет, выбары якіх адбудуцца 14 сакавіка, сярод дваццацёх „кандыдатаў” уведзена ня менш, як пяць маршалаў.»

На прыкладзе прыведзенага артыкулу бачым, што сярод мноства хвальшывых, дэзінфармуючых і тэндэнцыйных асьвятленьняў падсавецкіх праблемаў што раз часьцей паяўляюцца й аб'ектыўныя галасы, якія ацэньваюць падсавецкую запраўднасьць з найважнейшага ейнага аспэкту — нацыянальнага. Такія галасы астаецца толькі вітаць, бо, як звычайна, правільная ацэна ўсякай сытуацыі вядзе па простай лініі і да правільнай палітычнай рэакцыі на яе.

Р. С.

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

Адзін год бяз Сталіна

(Заканчэньне з 1-ай балоны)

шэфа савецкае дзяржавы, што раз болей умацоўваецца. Няма сумліву, што і ў гэтым выдатна яму дапамог той-жа Захад, які не здабыўся на адвагу й станоўчасьць, каб выкарыстаць часовыя савецкія цяжкасьці й слабасьці, а прыглядаўся да падзеяў у ролі нэўтральнага абсэрватара.

Уся заходняя прэса згодна адзначае, што хаця Маленкаў, як дыктатар, ня можа ані сваім аўтарытэтам ані сілай улады раўняцца із Сталінам, патолькі аказаўся ён за Сталіна небясьпечнейшым. Сталін у сваей антызаходняй палітыцы быў больш безаглядным, грубым, гвалтоўным і нахабным. Ён свае дамаганьні ставіў ува ўсей астрыні. Такое паступаньне Сталіна ў час сыгналізавала аб запраўднай небясьпецы і мабілізавала Захад на самаабарону. Таму фактычнае аўтарства такіх важных абаронных мерапрыемстваў Захаду, як арганізацыя пляну Маршаля, стварэньне Атлянтычнага пакту ды плян эўрапэйскай абароннай супольнасьці многія на Захадзе прыпісваюць Сталіну.

Сталінскія наступнікі ўсё гэта робяць шмат спрытней і разумней. Яны, праводзячы тую-ж самую сталінскую палітыку, не завагняюць да такой ступені, як ён, міжнароднай сытуацыі, але ўмела ўсыпляюць заходнюю публічную апінію. Найлепшым гэтага прыкладам можа служыць Бэрлінская канфэрэнцыя. Расчараваўшы Захад у галіне палітычнай, Молатаў ня толькі ня згусьціў атмасфэры, але яе ў значнай ступені разладаваў, калі запрапанаваў Захаду шырокае супрацоўніцтва ў галіне гандлёвай, чым здабыў сабе галодных гандлю з савецкім блёкам Ангельцаў. І гэты правал Бэрлінскай канфэрэнцыі, які пры Сталіне напэўна завастрыў-бы міжнароднае напружаньне і павялічыў-бы мабілізацыйную гатоўнасьць Захаду, пры ягоных наступніках прайшоў бязбольна.

Новыя крэмлёўскія верхаводы ўмела й спрытна выходзяць таксама з нутраных цяжкасьцяў у Савецкім Саюзе. Як ведама, у галіне эканамічнай, у першую чаргу ў сельскай гаспадарцы, дагаспадарыліся бальшавікі да ручкі. І вось калі Сталін нічога сабе не рабіў з таго, што цэлыя мільёны ўміралі з голаду й цярпелі нячуваную галіту, ягоныя наступнікі ўмела задэманстравалі свае «клопаты» над працоўнымі. Добра разумеючы, што ніякая агрэсія ім не загражае, бо вайна можа быць справакаваная толькі імі, яны значна звольнілі тэмп цяжкой індустрыі, спынілі ажыцьцяўленьне «сталінскіх плянаў пераўтварэньняў прыроды», а больш зьвярнулі ўвагі на лёгкую індустрыю і на прадукцыю тавараў шырокага ўжытку. Грозны недастатак прадуктаў харчаваньня, які зьяўляецца вынікам руіннага стану калгаснай сельскай гаспадаркі, яны пачалі пакрываць імпортам, на што кідаюць вялікую колькасьць запасу золата, якое пры Сталіну зьяўлялася незачэпным скарбам. Гэткім чынам яны змогуць ператрываць часовы крызыс, замацаваць сваю ўладу, успакоіць грозныя фэрмэнты сярод насельніцтва, якія, як ведама, прыбіралі застрашаючыя разьмеры, каб потым надрабіць усё страчанае за кошт тых-жа працоўных, калі клапаціцца аб іх ужо можна будзе толькі на паперы.

Гэткім чынам вучні ня толькі дараўнялі свайму вучыцелю, але ў шмат чым перарасьлі яго. Сваёй хітрай, больш разумнай і гібкай палітыкай яны змаглі ўмацавацца ў пэрыяд сваей найбольшай слабасьці і не адступіць ані на шаг як на нутраным, гэтак і на вонкавым фроньце.

У нутраным укладзе сілаў Савецкага Саюзу зарысавалася за мінулы год адна выдатная зьмена. Пасьля ўпадку Бэрыі паліцыя была сапхнутая да ролі чыста паліцыйнай. Яна перастала быць тэй магутнай палітычнай сілай, якой была раней, асабліва пры Бэрыі, калі ёй былі падпарадкаваныя ўрад, партыя й армія. На месца паліцыі прыйшла цяпер до голасу армія, якая апошнім часам становіцца адным з наймагутнейшых дзейнікаў у жыцьці савецкай імпэрыі. Гэтае здэградаваньне паліцыі зусім не абазначае, што ў савецкіх рэспубліках можа аслабіцца хваля тэрору й сыстэма канцэнтрацыйных лягераў. Абсалютна не, бо, як мы й зазначылі, савецкая паліцыя захавала й надалей свае паліцыйныя функцыі, толькі згубіла сваё дасюлешняе надраднае палітычнае значэньне.

Зразумела, што і гэтая перастаноўка роляў — здэградаваньне зьненавіджанай паліцыі й высуненьне на першы плян арміі, да якой насельніцтва адносіцца пазытыўна, — магло выйсьці сталінскім наступнікам толькі на карысьць. І калі гэтая перастаноўка была зробленая з гледзішча на ўціхаміраньне незадаваленьня народных масаў, дык трэба прызнаць, што Крэмль і ў гэтым выпадку дасягнуў сваю мэту.

Пасьлясталінскі пэрыяд аказаўся яшчэ цяжэйшым для нерасейскіх народаў Савецкага Саюзу. Сяньня ўжо ясна, што Бэрыя прабаваў паставіць стаўку на нерасейскія народы й выкарыстаць іхныя нацыянальныя імкненьні для замацаваньня собскае ўлады, што й было аднэй, магчыма найвялікшай, прычынай ягонага ўпадку. Бэрыя, як даўгалетні шэф усемагутнага паліцыйнага апарату, бясспрэчна найлепей арыентаваўся ў сіле нацыянальных імкненьняў нерасейскіх народаў. Тое, што на гэтыя народы ён рабіў стаўку, гэта найлепшы доказ, што патэнцыяльная сіла нацыянальных імкненьняў у нерасейскіх рэспубліках вялізарная.

Ліквідацыя здэмаскаванага Бэрыі сталася сыгналам да новага паходу Крэмля супраць адцэнтравых імкненьняў у нацыянальных рэспубліках і запачаткавала новую фазу яшчэ больш безагляднае русыфікацыі. Гэта выявілася навонкі з аднаго боку ў вялікіх чыстках у ўрадавых і партыйных апаратах гэтых рэспублікаў, а з другога — у ўзмоцненым акцэнтаваньні вядучай і кіруючай ролі «вялікага рускага народу», у вабнагленьні расейскага мэсіянізму. Усе царскія заваяваньні сяньня яшчэ нахабней, чымся пры Сталіне, выясьняюцца й апраўдваюцца, як вялізарныя «дабрадзействы» для паняволеных народаў, якія быццам адказвалі волі й імкненьням гэтых народаў. 300-ая гадавіна Пераяслаўскага дагавору, на моцы якога Хмяльніцкі прыняў пратэктарат Масквы, шырака выкарыстоўваецца дзеля прапаганды «дабравольнага» й «вечнага» задзіночаньня з Масквой ня толькі Украіны, але і ўсіх падбітых і заграбленых ёю краёў і народаў на працягу ўсяе гісторыі расейскага імпэрыялізму.

Гэтак агульны білянс першага году, які перажыў Савецкі Саюз бяз Сталіна, выпаў на карысьць Савецкага Саюзу і на шкоду народам вольнага сьвету і нерасейскіх народаў, паняволеных бальшавізмам. Гэты год паказаў, што сталінскія наступнікі, умела перамагаючы палітычныя й эканамічныя цяжкасьці й слабасьці, ня толькі апанавалі сытуацыю ўнутры краіны, ня толькі ўтрымалі свае пазыцыі навонкі, ня толькі часова ня спынілі сваіх наступаў, але іх значна ўзмоцнілі. А тарнуючы больш гібкую тактыку, чымся самаўпэўнены дыктатар Сталін, здабылі большыя шансы на далейшы пасьпех. Дэмакратычны Захад, які не патрапіў выкарыстаць часовага крызысу ў Саветах пасьля сьмерці Сталіна і абыякава прыглядаўся да антысавецкіх фармэнтаў за зялезнай заслонай, у вялікай меры сам паносіць адказнасьць за няўхільную небясьпеку, якая ўсей сваей грозай завісьне над ім, як толькі бальшавікі ўпарадкуюць сваё нутранае жыцьцё і канчальна замацуюць сваю ўладу.

Так, білянс першага году бяз Сталіна зьяўляецца вельмі сумны.

Язэп Каранеўскі

З хворай галавы на здаровую

(Заканчэньне з 1-ай балоны)

тварае Заходнюю Нямеччыну «на стагодзьдзі» ў «напоўакупаваную дзяржаву». «Заходнянямецкія рэванжыстыя» падпісалі гэты дагавор толькі дзеля таго, што ён прыводзіць да стварэньня новых нямецкіх збройных сілаў. Ужо цяпер існуюць пляны выстаўленьня ад 25 да 60 заходнянямецкіх дывізіяў замест афіцыяльна плянаваных дванаццацёх.

«Разьвязаньне нямецкага пытаньня залежыць ад галоўнай праблемы: будзе адроджаны нямецкі мілітарызм ці ня будзе», — асьветчыў Молатаў. Ня толькі Савецкі Саюз зьяўляецца супраць выстаўленьня нямецкіх збройных сілаў перад мірным дагаворам зь Нямеччынай. Супраціў перад палітыкай эўрапэйскай абароннай супольнасьці ўзмацняецца «ў Францыі, Вялікабрытаніі і навет у Заходняй Нямеччыне». Як доказ, прывёў Молатаў «узрастаючы супраціў у францускім парляманьце», адмову «амаль палавіны дэпутатаў ангельскай партыі ляйбарыстых» і «апазыцыю заходнянямецкіх сацыялдэмакратаў супраць рэмілітарызацыі за кошт адкладу задзіночаньня Нямеччыны». Толькі таму ня быў падпісаны мірны дагавор з Аўстрыяй, што заходнія дзяржавы не захацелі адмовіцца ад пляну эўрапэйскай арміі і небясьпекі новага «аншлюсу». Молатаў процівставіў пляну эўрапэйскай абароннай супольнасьці заходніх дзяржаваў свой Бэрлінскі праект «агульнаэўрапэйскага дагавору калектыўнай бясьпечнасьці» з удзелам Савецкага Саюзу, але без Амэрыкі.

У справе Жэнэўскай канфэрэнцыі савецкі міністар заявіў: «26 красавіка займе Кітайская Народная Рэспубліка ў Жэнэве зь іншымі вялікадзяржавамі законна ёй належнае месца. Толькі тады прадстаўнікі пяцёх дзяржаваў змогуць разважаць канчальнае ўрэгуляваньне карэйскага пытаньня... Тады дойдзе да таго, каб шляхам перагавораў разьвязаць цяжкую задачу міру ў Індакітаі».

Вось найважнейшыя тэзы прамовы Молатава. Хаця яны ў васнаўным зьяўляюцца паўтарэньнем ягоных бэрлінскіх дамаганьняў, маюць аднак і новы аспэкт: мацнейшае, чымся ў Бэрліне, заакцэнтаваньне нэгатыўнага становішча Саветаў да эўрапэйскай арміі і небясьпекі «нямецкага мілітарызму».

Вынік Бэрлінскай канфэрэнцыі ў вагульным білянсе ня быў Саветам карысны. Молатаў сваім захоўваньнем у Бэрліне замацаваў адзінства заходніх вялікадзяржаваў. Гэтае захоўваньне Молатава прынесла Саветам шкоду і ў галіне прапагандовай: у Нямеччыне дзякуючы ягонай катэгарычнай нязгодзе на правядзеньне свабодных выбараў, у Аўстрыі з прычыны ультыматыўнага дамаганьня астаўленьня савецкай акупацыйнай арміі на аўстрыяцкай тэрыторыі і пасьля падпісаньня мірнага дагавору, у Францыі палітыка Молатава ўзмоцніла пазыцыі Бідо і павялічыла шансы ратыфікацыі дагавору аб эўрапэйскай абароннай супольнасьці.

У сувязі з гэтым Молатаў мусіў сказаць нешта такое, каб узмоцніць свой моцна пахіснуты аўтарытэт у сьвеце і высунуць новыя аргумэнты, каб паўстрымаць Францыю перад ратыфікацыяй. Для дасягненьня першае мэты ён намагаўся сугэраваць, што зьяўляецца галоўна ягонай заслугай, што дойдзе да Жэнэўскай канфэрэнцыі з удзелам камуністычнага Кітаю, і зрабіў нядвузначныя алюзіі, што канфэрэнцыя гэтая мае ўсе дадзеныя разьвязаць як пытаньне Карэі, гэтак і справу індакітайскай вайны, у якой зацікаўленая асабліва Францыя. Для дасягненьня другой мэты Молатаў узмоцніў свае атакі супраць эўрапэйскай арміі. Як ведама, на Бэрлінскай канфэрэнцыі ён выступаў ня столькі супраць эўрапэйскай арміі, сколькі супраць Атлянтычнага пакту, і дамагаўся, каб Амэрыка зусім пакінула Эўропу. Такая пазыцыя Саветаў выклікала ў Францыі зусім адваротную рэакцыю й павялічыла колькасьць прыхільнікаў эўрапэйскай арміі. У Парыжы абудзілася пабойваньне, што савецкія мерапрыемствы бясьпечнасьці Эўропы могуць пайсьці па лініі амэрыканскай палітыкі ашчаднасьці. А Францыя зацікаўленая ў тым, каб Амэрыка трымала свае збройныя сілы ў Эўропе. Бідо, як ведама, дамагаўся, каб амэрыканскія збройныя сілы аставаліся ў Эўропе і пасьля стварэньня эўрапэйскай арміі. Таму Молатаў цяпер і скарыгаваў сваё Бэрлінскае дамаганьне ў тым сэньсе, што для Саветаў эўрапэйская армія зьяўляецца ня менш няпрыймальнай, чымся і сам Атлянтычны пакт.

(-іч)

210 мільёнаў жыхароў СССР

Чарговыя выбары ў Вярхоўны Савет СССР, што адбудуцца 14 сакавіка сёлета, з палітычнага гледзішча ня маюць найменшага значэньня. Гэта звычайная фармальная працэдура, калі месца адных статыстых у пародыі савецкага парляманту займуць на наступныя чатыры гады іншыя статыстыя, зусім не зьяўляючыся, як і першыя, запраўднымі прадстаўнікамі народу.

Савецкія выбары маюць для нас затое іншую вартасьць. Яны, пры адсутнасьці перапісу насельніцтва, даюць больш менш дакладнае ўяўленьне аб колькасьці насельніцтва Савецкага Саюзу і ягоным прыросьце за апошнія чатыры гады, калі адбываліся папярэднія выбары.

У гэтым годзе будзе ў Савецкім Союзе 30 выбарных акругаў болей, чымся падчас апошніх выбараў у 1950 годзе, пайменна 700 замест 670. Так як тэарэтычна кажная выбарная округа абыймае 300.000 насельніцтва (ня выбіральнікаў), з гэтага можна зрабіць вывад, што насельніцтва Савецкага Саюзу за апошнія чатыры гады павялічылася прыблізна на дзевяць мільёнаў чалавек. Прырост насельніцтва ад 1950 году ёсьць такім чынам удвая большы, чымся ад 1946 да 1950 году. Тады колькасьць выбарных акругаў была павялічаная толькі на 14, што адказвала прыросту насельніцтва на чатыры мільёны. На падставе колькасьці выбарных акругаў усё насельніцтва Савецкага Саюзу павінна сяньня выносіць каля 210 мільёнаў чалавек.

Новаствораныя выбарныя акругі паказваюць, што асабліва моцна разьвіўся Сібір і савецкі Далёкі Ўсход. Згодна з гэтым насельніцтва рэдка заселеных усходнясібірскіх правінцыяў за апошнія чатыры гады павялічылася на 1,8 мільёна чалавек. Новыя выбарныя акругі створаныя тут, між іншым, у пустыннай правінцыі Ўладывастоку, у правінцыі Чыта і Іркуцку, у паўночнай частцы правінцыі Краснаярску ў сярэднім Сібіры, як і ў Аўтаномнай Савецкай Якуцкай Рэспубліцы. Таксама нядаўна асвоеная правінцыя Магадан, што зьяўляецца цэнтрам савецкіх капальняў золата і заселеная пераважна прымусовымі работнікамі, якія ня маюць выбарных правоў, а тым самым і пры ўтварэньні выбарных акругаў пад увагу не бяруцца, творыць цяпер адну выбарную округу.

Намаганьні савецкага ўраду паўстрымаць далейшы рост насельніцтва пераналенай Масквы, здаецца, асталіся дарэмнымі. Бо і Масква атрымлівае ўзноў адну новую выбарную округу, што абазначае далейшы прырост ейнага насельніцтва на 300.000 чалавек. Уся Масква мае 18 выбарных акругаў, што адказвае 5,4 мільёнам насельніцтва.

Што разьвіцьцё Савецкага Саюзу на працягу апошніх чатырох гадоў, як і раней, ішло пад знакам індустрыялізацыі, паказвае павялічэньне выбарных акругаў у Данецкім басэйне і на Урале. Правінцыя Чалябінск атрымлівае дзьве новыя выбарныя акругі, а правінцыя Сталіна навет тры. Далей былі створаныя дадатковыя выбарныя акругі ў прамысловых раёнах Варашылаўграду, Днепрапятроўску і Нікалаева. Адна новая выбарная округа была створаная ў Аўтаномнай Татарскай Рэспубліцы, якая зьяўляецца важным цэнтрам нафтавай індустрыі. Затое ў Узбэкістане, Кіргізіі й Туркменіі адбылося навет зьмяншэньне насельніцтва, бо колькасьць выбарных акругаў у гэтых рэспубліках не павялічылася.

ЧЫТАНЬНЕ «БАЦЬКАЎШЧЫНЫ» ЗАДАРМА — ЗЯЎЛЯЕЦЦА НАЦЫЯНАЛЬНЫМ ПРАСТУПКАМ

УВАГА! УВАГА!

ГАДАВІКІ «БАЦЬКАЎШЧЫНЫ» Й «КАЛАСКОЎ»

З Адміністрацыі «Бацькаўшчыны» можна выпісаць:

1. Поўны камплет «Бацкаўшчыны» за 1953 год (не апраўлены) за 4 амэрыканскія даляры, або іхную раўнавартасьць у іншай валюце.

2. Поўны камплет «Бацькаўшчыны» за 1952 год (не апраўлены) за 4 амэр. даляры.

3. Поўны камплет «Бацькаўшчыны» за 1951 год (№№ 65-79) за 2 амэр. даляры.

4. Камплет «Каласкоў» ад нумару 4 да 20 ўключна (№ № 1, 2 і 3 друкаваліся, як 3-яя балона «Бацькаўшчыны») за 1952-1953 г.г. (у цьвёрдай вокладцы) за 2,5 амэр. даляры.

Так як успомненых камплетаў Рэдакцыя мае вельмі малую колькасьць, жадаючым іх атрымаць радзім сьпяшацца з выпіскай.

Р. СКЛЮТ

Званар Адраджэньня

(ВАЦЛАЎ ЛАСТОЎСКІ)

(Працяг)

IV

Немагчыма цяпер, ня маючы пад рукамі ані гадавікоў «Нашае Нівы», ані паказаньняў жывых сьветкаў, прасачыць дакладна, ад калі й ад чаго пачалося супрацоўніцтва Ластоўскага ў першай сталай і трывалай беларускай газэце. Трэба думаць, што супрацоўнічаць тут Ластоўскі, як і бальшыня іншых, пачаў, як аўтар, а ўжо выявіўшыся такім, дайшоў да становішча сакратара рэдакцыі, займаючы яго ад 1909 да 1914 г., прычым у 1912-1913 г.г. адначасна дзеячы і ў ролі фактычнага рэдактара часапісу. Як аўтар выступаў у «Нашай Ніве», паводля прынятай у ей традыцыі, пад рознымі псэўдонімамі, поўны пералік якіх таксама цяпер немагчымы; ведама толькі, што галоўным ягоным псэўдонімам быў даволі празрысты скарот зь ініцыялу ймя й пачатку прозьвішча — «Власт». Другі з найчасьцей ужываных псэўдонімаў — «Юры Верашчака»; былі й іншыя псэўдонімы й крыптонімы, як «В. Л.», «Ю. В.» і інш.

Ужо на пачатку сакратарства Ластоўскага ў «Нашай Ніве» рэдакцыя, як падаець ён сам у сваіх успамінах пра Максіма Богдановіча (часапіс «Крывіч», № 1 /11/ за 1926 г.), падзялялася на дзьве часткі, якія адзін із прыбылых у Вільню тады нашаніўцаў, Сяргей Палуян, назваў «верхняй і ніжняй палатамі». «Верхняя палата» ў складзе. А. Уласава (афіційны рэдактар газэты тады), братоў Івана й Антона Луцкевічаў (фактычныя галоўныя рэдактары), Язэпа Манькоўскага (псэўдонім «Янка Окліч») і А. Чыжа (псэўдонім «Альгерд Бульба») станавіла сабою, як кажуць, галоўку рэдакцыйнага штабу. Ніжняй-жа «палатай» фактычна быў сакратарыят рэдакцыі, галоўнай асобай у якім і дзеяў Ластоўскі, як сам сакратар; апрача яго, тут-жа працавалі Янка Купала, Ядвігін Ш. (псэўдонім А. Лявіцкага). Сяргей Палуян ды мастак Язэп Драздовіч. Паводля ўспамінаў самога Ластоўскага, падзел сфэраў між абедзьвюма «палатамі» выглядаў так, што «за зачыненымі й завешанымі цяжкой драпэрыяй дзьвярыма ў гасподзе «верхняй палаты» вяршыліся «высокія» палітычныя матэрыі», тымчасам як «ад вуліцы-ж у «ніжнюю» палату йшла публіка «чорная» й «шэрая». З гэтаю «публікай», з самой грамадой, масай, што цягнулася да «Нашае Нівы», і мусіў найперш мець дачыненьне Ластоўскі, як сакратар рэдакцыі, як галоўная асоба ейнае «ніжняе палаты». Дык і сама праца ягоная мела нямінуча характар працы нацыянальна-грамадзкае й навет масавае больш, чымся каго іншага ў рэдакцыі. Праца гэтая й давала яму найперш і найбольш і натхненьне і матар'ял да ўжо чыста-журналістычнай работы ў рэдакцыі і ў самой газэце. Яна-ж і ператварала яго ў тую «душу» газэты, што і ўмесцавілася гэткім парадкам у «ніжняй палаце» ейнай рэдакцыі ды там і ўмацоўвалася іншымі «ніжняпалатнікамі», тымчасам як у «верхняй палаце» канцэнтраваліся самыя рэдакцыйныя, казаў той, «мазгі».

Адылі, як ведама, «Нашай Ніве» давялося ў нас быць ня проста газэтай, а кіраўнічым ворганам ёю-ж і заініцыяванага нацыянальнага адраджэньня. Галоўны-ж, найбольшым нашаніўскім «прарокам» — паэтам Янкам Купалам сфармуляваны лёзунг гэтага адраджэньня — «людзьмі звацца» — у сваім ужыцьцяўленьні вымагаў ад тых, што ўзяліся за яго, — дзеля таго, каб «зраўняцца зь людзьмі, працаваць так, каб усё ў нас было», паводля формулы ўспамінанага вышэй другога, хоць і трагічна недаўгавечнага, адраджэнскага «прарока» (дый такога-ж, як Купала, «ніжняпалатніка» (Сяргея Палуяна) між іншага, гэтыя Палуянавы словы былі пададзены ўпяршыню якраз Ластоўскім у ягоным нэкралёгу «Памяці Сяргея Палуяна», у «Нашай Ніве» № 18 за 1910 г.). Значыцца, трэ было «працаваць так, каб была ў нас ня толькі журналістыка, ці публіцыстыка, але й літаратура наагул — і мастацкая і навуковая (значыцца — і сама навука), але і палітыка і іншае ды іншае — «ўсё», што ў людзёў і як у людзёў. А як мала каму было яшчэ «працаваць так», дык і даводзілася гэным працаўніком нямінуча ставацца ня толькі працаўнікамі грамадзкімі й ня толькі журналістымі ці літаратурамі, але адначасна, у меру магі, і наўчонымі, і палітыкамі і іншым ды іншым — ізноў-жа, «усім», каб стварыць тое «ўсё». Гэткімі й мусілі быць, дый былі, нашыя нашаніўцы-адраджэнцы, у тым ліку ды на адным зь першых месцаў — і наш Ластоўскі. Той-жа Янка Купала ў ваднэй з сваіх эпіграмаў трапна падаў вобраз-тып такога нашаніўца-адраджэнца:

Ён і работнік грамадзянскі,
Мужыцкі пан і служка панскі,
І антыквар, і археолёг,
І бібліёлёг, і філёлёг.
І быў-бы слаўным ён зусім,
Каб быў чым-колечы адным.

Хоць гэтая Купалава эпіграма і мела на ўвеце канкрэтна, як пераказваюць, аднаго з найгалаўнейшых лідэраў нашаніўства Івана Луцкевіча, але яе сьмела можна прыкласьці й да кажнага іншага запраўднага нашаніўца-адраджэнца, а між іх — да нашага Ластоўскага найперш і найбольш. Усе Купалавы пералічэньні, усе гэтыя «і» ня толькі прыстаюць да яго поўнасьцяй (хіба мо толькі другі радок вымагаў-бы нейкае мадыфікацыі ці паслабленьня), але сьцяг іхны можна было-б і працягнуць яшчэ, хоць бы гэткімі, скажам, радкамі, да Івана Луцкевіча ўжо няпрысталымі:

... І журналісты й публіцысты,
Гісторык, крытык, бэлетрысты...

Але-ж, і гэтым усім выявіўся Ластоўскі. Ды, пэўна-ж, і для яго справядлівыя апошнія, чыста ўжо эпіграматычныя Купалавы радкі, з тым хіба ўдакладненьнем, што славу сабе здабыў-бы і ён большую яшчэ, каб мог стацца «чым-колечы адным»... Але аб гэтым дакладней — далей, калі выясьняцца хоць з большага тыя галоўныя «і», што мусіў злучаць у сабе верны ідэі й вымозе нашага адраджэньня Вацлаў Ластоўскі.

(Далей будзе)

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

Няма розьніцы між СССР і царскай Расеяй

У № 9 польскага лёнданскага тыднёвіка «Ожэл Бялы» за 27 лютага 1254 г. супрацоўнікам гэтае газэты Ю. Вэндэлем была зрэфэраваная адна мала ведамая, але нязвычайна цэнная й цікавая кніга аднаго францускага аўтара аб Расеі. Кніга зьяўляецца на столькі фасцынуючая й рэвэляцыйная трапнасьцю і ўнікліваcьцю спасьцярогаў, а артыкул аб ёй польскага аўтара на столькі робіць правільныя зь яе вывады, што нельга паўстрымацца, каб не пазнаёміць беларускага чытача з найцікавейшай для нас часткай гэтага артыкулу, а за пасярэдніцтвам яго — і з самой кнігай. Узяўшы за motto словы ведамага расейскага рэвалюцыянэра Гэрцэна аб будучым расейскім камунізьме — «Камунізм будзе ў Расеі дэспатызмам, перавернутым дагары нагамі» — польскі аўтар пачынае:

«Папала мне ў рукі абсалютна рэвэляцыйная кніга аб Расеі. Кніга, якая дае аб гэтай непраўдападобнай краіне веду бесканечна большую, чымся ўсе іншыя кнігі, якія аб ей калі-небудзь былі напісаныя.

Аўтар падчырквае ў прадмове кардынальную загану публікацыяў аб Расеі. Дагэтуль — гаворыць — страх аб інтэрас дыктаваў пераўвялічаныя пахвалы, а ненавісьць пад'юджвала да распаўсюджваньня ачэрніваньня. У мяне няма ані страху, ані ненавісьці.

Чытач пераканаецца з далейшай справаздачы, што гэтак ёсьць у запраўднасьці. Рэвэляцыя, аб якой пішам, зьяўляецца аб'ектыўнай.

ЛГАРСТВА ФУНДАМАНТАМ ГРАМАДЗКАГА ЛАДУ

Аўтар паказвае на цяжкасьці, якія насоўваюцца перад замежным абсэрватарам, які шукае праўды.

«Усе чужаземцы зьяўляюцца разгляданыя, як злачынцы пры ўезьдзе ў Расею. Зьяўляюцца абвінавачанымі пакуль маглі-б стацца абвінавачваючымі».

«Падарожнік, які сабе дазволіў падацца прапагандзе тых, заданьнем якіх зьяўляецца мець над ім апеку, мог-бы пераехаць імпэрыю ад канца да канца і нічога не заўважыць з панад раду фасадаў. І гэта ёсьць якраз тым, чаго жадаюць сабе гаспадары.»

Расея жыве ў змроку. У змроку зьяўляецца зануранае ейнае насельніцтва і змрок ствараецца вакол тых, якія хацелі-б адсланіць ейныя тайніцы.

«Ніколі ня перастане зьдзіўляць мяне абраз народу, які пасоўвае сваю абыякавасьць да таго, што згаджаецца жыць і ўміраць у імгле, у якую яго спавівае палітыка ўраду. Дагэтуль я ўважаў, што чалавек таксама ня можа абыйсьціся безь сьвятла для духа, як без паветра для цела. Падарожжа ў Расею пераканала мяне, што я мыліўся. Тут лгарства зьяўляецца неабходным для ўтрыманьня грамадзкага парадку; абвешчаньне праўды абазначае яго зьнішчэньне.»

Аўтар бачыць нутраную лёгіку ў монструальнай расейскай запраўднасьці:

«Чым болей абсэрвую Расею, тым больш прызнаю правільнасьць ейным уладаром, што забараняюць падарожжа заграніцу і робяць чужаземцам доступ да іхнага краю гэтак цяжкім. Палітычная сыстэма Расеі ня выдзержыла-б дваццацёх год свабодных дачыненьняў з Заходняй Эўропай.»

Дзе ляжыць прычына дыпляматычных сукцэсаў Расеі? Аўтар адказвае:

«Калі Расея мае лепшых дыпляматаў, чымся народы з высокай культурай, дык дзеля таго, што нашыя газэты інфармуюць іх аб усім, што робіцца, і аб усім, што плянуецца ў нашых краёх. Замест разважна хаваць нашую слабасьць, адсланяем яе з палкай прагнасьцю; тады, калі бізантыйская палітыка Расейцаў, дзеючы ў змроку, старанна перад намі хавае, што думае, робіць і прыгатаўляе ў сваім краі. Мы дзеім у поўным сьвятле; яны дзеюць у цемнаце: ігра між намі зьяўляецца аднабокай. Іхная скрытасьць нас асьляпляе; нашая адкрытасьць іх асьвятляе. Мы маем слабасьць многамоўства; яны маюць сілу тайнасьці. У гэтым ляжыць галоўная прычына іхнай мудрасьці.»

Аўтар бачыць будучыню пэсымістычна:

«Ад часу майго падарожжа ў Расею будучыня мне паяўляецца ў чорных хварбах.

Толькі ў Расеі адкрываюцца вочы на застрашаючы рэзультат спалучэньня веды Захаду з гэніем Азіі».

Расейцы дасканальна ведаюць, да чаго імкнуцца:

«Расея глядзіць на Эўропу, як на здабычу, якую нашыя сваркі раней ці пазьней кінуць у ейныя рукі. Пад'юджвае яна анархію ў нашых краёх; ведае, што карупцыю, якую старанна ў іх засявае, удасца выкарыстаць для ажыцьцяўленьня ейных мэтаў. Тое, што прыгатаўляе Расея для Эўропы — гэта паўтарэньне гісторыі Польшчы ў вялізарным маштабе».

Чытач шукае ў кніжцы адказу, як адхіліць гэтую катастрофу, якую прарочыць аўтар. На жаль, ня мае ён іншых лекаў апрача таго, што ўсе добра ведаем і аб чым ведаем, як нязвычайна цяжка гэта прымяніць:

«Калі антаганізмы ўціхамірацца на Захадзе; калі між народамі і ўрадамі запануе адзінства — грозныя замыслы хіжацкіх Славянаў стануцца пустой мрояй. Але каб гэта магло стацца, трэба адхіліць небясьпеку дапушчэньня іхнай інгэрэнцыі ў нашыя справы і ўплываньня на ход палітыкі нашых урадаў».

Інакш ноч расьцягнецца над Эўропай. Ейныя народы падзеляць лёс Расейцаў. Лёс — страшэнны. Аўтар ня ўмее знайсьці адказу, «за якую Боскую абразу 60 мільёнаў людзей ёсьць асуджаных на катаржнае жыцьцё ў Расеі».

РАСЕЯ МІКАЛАЯ ЦІ РАСЕЯ СТАЛІНА?

Сказаў: 60 мільёнаў асуджаных на жыцьцё ў Расеі? Але-ж ведама, што колькасьць асуджаных на жыцьцё ў Расеі ёсьць амаль чатырохкратна большая. Ці-ж-бы гэта была памылка аўтара? Не, не памылка.

Найбольшы час ужо сказаць чытачу, — чаго сам напэўна не дадумаўся-б, — што кніга, зьмест якой падаём, ня ёсьць сучаснай кнігай. Не апісвае цяперашняй расейскай запраўднасьці, хаця апісвае верна расейскую запраўднасьць незалежна ад часу. Яна была пісаная ў эпоху, калі Расея мела толькі 60 мільёнаў жыхароў і калі ёй яшчэ ня сьнілася аб тэй спэцыфічнай адмене расейскай аўтакрацыі, якая называецца бальшавізмам.

Аўтарам гэтай кнігі зьяўляецца Маркіз дэ Кустін; ейны арыгінальны назоў ёсьць «La Russie en 1839», назоў ейнага цяперашняга выданьня ангельскага ёсьць «Journey For Our Time» (Артур Баркер, Лёндан 1953). Упяршыню была яна выдадзеная ў Парыжы ў тым-жа 1838 годзе. У 1930 годзе была яна выдадзеная ў Расеі ў скарочаным выданьні, названым «Расея Мікалая». Вельмі шыбка аднак выданьне было забранае назад; відаць толькі пасьля надрукаваньня было заўважана, што Расея Мікалая зьяўляецца адначасна Расеяй Сталіна.

Як вызнавальнік скрайных манархістычных паглядаў Кустін паехаў у Расею, каб, як гаворыць — «знайсьці аргумэнты супраць рэпрэзэнтатыўных урадаў», дакладна таксама, як сто год пазьней вызнавальнікі камуністычных паглядаў езьдзілі ў Расею, каб пабачыць свае ідэялы, уведзеныя ў жыцьцё.

Кустін вярнуўся з паглядамі супраціўнымі тым, зь якімі паехаў; назаўсёды выбіў сабе з галавы аўтакратычныя ідэі; стаўся гарачым прыхільнікам канстытуцыйных формаў палітычнага жыцьця. Зусім дакладна таксама, як у нашых часох Жыд, Кэстлер і столькі іншых вярнулася з Расеі радыкальна вылечанымі зь ідэялаў, якія ў Расеі сталіся запраўднасьцю.

ЛАД ЗЬМЯНЯЕЦЦА — ТЫРАНІЯ ТРЫВАЕ

І таго і гэтых напоўнілі ненавісьцю тыя самыя асаблівасьці расейскага жыцьця. Асаблівасьці сталыя, нязьменныя, вечнатрывалыя. Выконваньне ўлады пры помачы бізуна; сьціслая ізаля-

(Заканчэньне на 4-ай балоне)

БАЛОНКІ МІНУЛАГА

Віленчукі на сталічных сцэнах

Вільня, калісьці слаўная сталіца беларускай дзяржавы, у XIX-XX стагодзьдзях уяўляла зь сябе адну із звычайных правінцыяў расейскае імпэрыі. Аднак нацыянальны беларускі рух і пасьля страты беларускае дзяржаўнасьці ня толькі захоўваўся там, але і часамі моцна прабіваўся навонкі. Зь Вільняй павязаныя падзеі паўстаньня Каліноўскага, адраджэнскага руху «Нашае Нівы» і г. д. Як ня была заціснутая беларуская справа, Вільня заўсёды трымалася як цэнтр беларускага жыцьця. Асабліва гэта датычыцца культурнае нівы.

З мастацкіх асяродкаў тут набылі сабе славу эстрадны тэатр І. Буйніцкага, драматычнае згуртаваньне Ф. Аляхновіча, харавы й танцавальны ансамбль Р. Шырмы. Трэба сказаць наагул, што ня гледзячы на «правінцыянальнасьць», Вільня ў тэатральным сэньсе лічылася заўсёды даволі буйным культурным пунктам, тут іграліі сэзонамі найлепшыя трупы сцэнічных дзеячоў. Гэтак у Вільні пачалі сваю тэатральную кар'еру такія зоркі сцэны, як ведамыя В. Камісаржэўская і П. Арленеў. Тут стварыўся потым ведамы ў Маскве тэатр Нязлобіна.

Віленская моладзь літаральна захаплялася тэатральным мастацтвам, гарэла й перажывала кажную сцэнічную зьяву і зь яе асяродзьдзя выйшла ці мала добрых актораў і музыкантаў. У гэтым артыкуле я хачу спыніцца на трох каранных Беларусах-віленчукох, што здабылі сабе славу на расейскіх сцэнах і ў сталіцах Пецярбурзе і Маскве.

Першым (паводля храналёгіі) быў актор імпэратарскіх тэатраў **Казімір Бравіч** (1861-1912), запраўднае прозьвішча якога было **Бараноўскі.** Ён нарадзіўся ў інтэлігентнай беларускай сям'і ў Вільні, дзе прайшла ягоная маладосьць і дзе пачалася ягоная тэатральная кар'ера побач зь ведамаю В. Камісаржэўскаю. Вельмі хутка Бравіч-Бараноўскі вылучаецца як вельмі здольны, таленавіты, а да таго і разумны, удумлівы актор. Яшчэ зусім маладым, ён грае галоўныя ролі і робіцца прэм'ерам. Бравіча заўважваюць буйныя гаспадары тэатральных трупаў (антрэпрэнэры) і перад ім адчыняюцца дзьверы лепшых сталічных тэатраў. Ён працуе ў Камісаржэўскай, у Маскоўскім Малым тэатры і Маскоўскім Мастацкім тэатры (у К. Станіслаўскага). Аснаўным і сталым месцам дзейнасьці для Бравіча робіцца выдатны імпэратарскі Малы тэатр, куды папасьці ўжо было казачным шчасьцем для «простага сьмяротнага». Там ён працуе разам із ведамымі сусьветнымі акторамі (Давыдаў, Садоўскі) і, больш таго, займае становішча першараднага выканальніка. Тут стварае Бравіч буйныя вобразы клясычных і бытавых гэрояў (п'есы Астроўскага), становіцца адным з найбольш папулярных і знаных дзеячоў сцэны, заслужвае назоў «улюбенца публікі». Гэты назоў Бравіч захоўвае праз усё сваё жыцьцё. Памёр Бравіч-Бараноўскі параўнальна яшчэ не старым чалавекам (51 год), у росквіце сваіх творчых сілаў і здольнасьцяў. Аб дзейнасьці Бравіча можна знайсьці даволі многа радкоў прыхільных, цёплых і ўдзячных у ўспамінах Камісаржэўскай, Няміровіча-Данчэнкі, Арленева, Сабальшчыкова-Самарына і іншых.

Калі Бравіча-Бараноўскага лёс дарыў шчасьцем і ўдачамі, дык другога мастака-віленчука **В. Смалякова** гэты лёс, наадварот, чамусьці перасьледваў усё жыцьцё. В. Смалякоў быў таксама вельмі здольны актор, што пабываў і на сталічных сцэнах, ды, на жаль, ён хутка патрапіў у сеці тэатральнае багэмы і на столькі запутаўся ў іх, што ў недалёкім часе з сур'ёзных, паважных тэатраў апынуўся ў фарсавых, скаброзных, рыначных трупах, апусьціўся нізка і як чалавек. Аднак талент Смалякова быў на столькі яскравы, што і на захалусных падмостках ён часам даходзіў да выключнага адтварэньня сцэнічных вобразаў. Сярод антрэпрэнэраў, крытыкаў і актораў увесь час яшчэ трымалася слава і папулярнасьць Смалякова, як незраўнанага й выдатнага коміка і прастака.

Найбольш глыбокім і выдатным талентам аказаўся трэйці Беларус-вілянчук — **Васіль Качалаў,** яшчэ нядаўна памерлы. Качалаў нарадзіўся ў Вільні ў 1875 г. у патрыярхальнай старавіленскай сям'і. Бацька ягоны быў вуніяцкім сьвятаром, матка таксама з духоўных. Запраўднае прозьвішча Качалава было **Швярубовіч** і тут дарэчы расказаць цікавы факт атрыманьня тэатральнага псэўдоніму — Качалава. Васіль Швярубовіч з маленства захапляўся тэатрам і мроіў стацца акторам. Гастрольная трупа Камісаржэў-

(Заканчэньне на 4-ай балоне)

ВЛАСТ (ВАЦЛАЎ ЛАСТОЎСКІ) 4)

Выбраныя творы

СОЖ І ДНЯПРО

Сярод глухіх пушч, цёмных бораў, на прыгорку, стаялі калісь старыя-прастарыя харомы вялікага валадара, сівавалосага старца Рыдана. З канца ў канец зямлі слыў Рыдан багацьцем нялічаным, а над усе багацьці славілася скрытая за дванаццацьцю дзьверамі, дванаццацьцю замкамі залатая Рыданава карона. Як адмыкалі замкі, адчынялі дзьверы і выносілі тую карону на сьвет, то, калі на сьвеце была ноч, яна днём станавілася, а калі была зіма, то перамянялася ў лета; — так зігацелі дарагія каменьні на Рыданавай залотай кароне.

Завідавалі суседнія валадары і князі гэтай кароне і пастанавілі дабыць яе ў Рыдана. Сазвалі варажбітоў і знахароў і загадалі ім прыдумаць спосаб, каб украсьці карону з Рыданавага скарбца. Варажбіты і знахары думалі тры дні і тры ночы і прыдумалі разрыў-траву, каторай, калі дакрануцца замкоў, то самі адчыняюцца, ды сон-траву, зярняткамі каторай калі пасыпаць, то ўсё наўкруг засынае. Прыдумаўшы гэта, паслалі зладзеяў красьці залатую Рыданаву карону. Тыя, прышоўшы пад харомы, сыпнулі сон-зельле, і ўся варта паснула; крануліся разрыў-травой замкоў, і замкі паспадалі. Тады ўзялі яны залатую Рыданаву карону і пусьціліся назад.

Устаў раніцай сівы Рыдан, падыйшоў да вакна, ажно глядзь: усе варты покатам сьпяць, увесь народ у сьне беспрабудным валяецца. І зразумеў стараць адразу, што няма ў скарбцы яго залатой кароны. Падыйшоў ён тады да звана, ударыў раз, ударыў два, і разбудзіліся два Рыданавы сыны: Сож і Дняпро. Зьвярнуўся бацька да Дняпра і кажа: «Вазьмі, сынок, сталёвую зброю, каваны меч і бяжы садамі, лугамі аж да скалістых гор: мо' дагоніш цікунцоў з каронай».

Схапіўся Дняпро і чым хутчэй пабег, а Сож астаўся пры бацьку. Сеў на залаты пасад стары Рыдан і кажа сыну:

— Прылажы, сынку, вуха да зямлі, паслухай, ці бяжыць Дняпро? —

Прылажыў Сож вуха да зямлі і кажа:

— Бегма-бяжыць і не стаміўся яшчэ. І другі раз кажа бацька:

— Прылажы, сынку, вуха да зямлі, паслухай! — Прылажыў сын вуха да зямлі і кажа:

— Бяжыць, але цяжка дыхае — шум зямлёй ідзе, і ўтрэцьце сказаў бацька паслухаць сыну. Сын прылажыў вуха да зямлі і кажа:

— Гул зямлёй ідзе і крык вялікі. Тады ўстаў Рыдан з пасаду і кажа:

— Бяжы-ж ты, сынку, імхамі-балотамі на падмогу яму, бо сам адзін не праб'ецца ён праз скалістыя горы. Пусьціўся Сож імхамі, балотамі на падмогу брату, а стары бацька сам астаўся ждаць сыноў. Доўга ждаў стары; не дождаўшыся, з маркоты вялікай пачаў плакаць:

— Бадай вам, дзеткі мае, сьлязамі разьліцца!

Ды ўлучыў ён такі мамэнт, што такі запраўды разьліліся сьлязамі браты і стары бацька: ў рэкі ўсе тры зьмяніліся.

Дняпро плыве садамі ды лугамі, Сож імхамі ды балотамі, а Рыдан — куды вочы глядзяць. А з таго часу ўсе сілы ляснога краю плывуць у чужое мора і там прападаюць . . .

ЮГА І ГРАМАВІК

Гадоў таму капы ізь дзьве будзе, як у вёску Дзянісава прыйшла, неяк пасьля Зьмітраўскіх Дзядоў, тоўстая баба. Сюды-туды пакруцілася па вёсцы і шусь да Прахора ў хату, дый кажа:

— Я ня тутэйшая, але чула аб вашэці, што чалавек добры, і прыйшла папрасіцца на кутніцу. Каштаваць я вам нічога ня буду, яшчэ і вы каля мяне заробіце, калі за мае грошы пракорміце мяне.

Прахор падумаў, парадзіўся з жонкай і прыняў тую невядомую бабу да сябе ў хату.

Баба адразу дала Прахору сотню рублёў «на руку». Прахор дачакаўся да вечара, рады пайшоў спаць.

На другі дзень, устаўшы, садзіцца сям'я сьнедаць; калі хопяцца, ажно з чатырох булак хлеба, што былі ў істопцы, і паміну няма. Гэтак сама ня ведама куды счэзьлі са два сыры і цэлы кумпяк сьвініны. У хаце, ведама, гоман узьняўся, бо ўсе думалі, што ноччу злодзей улез у істопку. Ажно тут будзіцца новапрынятая кутніца і кажа:

— Супакойцеся, гаспадару, гэта я ўночы вячэрала. Паварушылася да сьцяны і захрапела.

Усе толькі пераглянуліся між сабою, паківалі моўчкі галовамі і чакалі, што далей будзе.

Хлеб тады танны быў, то што Прахору? Абы толькі грошы! І баба не шкадавала грошы. Прахор тое толькі і рабіў, што скупляў па ўсей ваколіцы збожжа, мяса і ўсякія іншыя харчы ды карміў сваю кутніцу. Гэтак, дачакаўшы Каляд, Прахор выкупіў ужо ўсе харчы сваей ваколіцы і каля запуст павінен быў езьдзіць з фурманкай па харчы ажно пад Задарожжа, Друю і пад Глыбокае.

А зіма настала сярдзітая: з дня ў дзень траскучыя марозы. Найстарэйшыя людзі ня памяталі гэткай сьцюдзёнай. На Вялікдзень і то яшчэ зіма ня ўнімалася: сьнягі на палёх ляжалі гурбамі і рэкі стаялі. На Праводную людзі на могілкі хадзілі памінаць Дзядоў па сьнягу і ў кажухох.

І хоць у Прахора грошы было на закуп харчоў, сколькі трэба, але купіць штораз цяжэй было. Страх яго агарнуў, што гэта за пражорлівая баба зьявілася ў яго.

Гэтак думаючы, едзе ён Гарманаўскім трактам на Пагост, і якраз у Падорскай пушчы коні спыніліся і ня йдуць далей.

Ён іх лейцамі і пугай, а тыя ані зь месца! Вылез Прахор з розвальняў і падыйшоў дарогай паглядзець, ці — барані Божа, — ня воўча руя заступіла яму дарогу. Толькі ён гэта адыйшоўся з двое гоняў, ажно бачыць: выяжджае зь лесу нейкі малады чалавек на белым кані. І чалавек і конь у залатой зброі, аж мігцяць у вачох. Прахор гэтак спужаўся, што ня мог крануцца зь месца, а незнаёмы рыцар пад'ехаў да яго і кажа:

— Ня бойся мяне, Прахор, я — Грамавік, прыяцель і апякун людзей і вораг іхніх ворагаў. Баба, што ў цябе жыве, няпростая. Гэта Баба-Юга, яна па начах у зялезнай ступе езьдзіць і холад на зямлю наганяе, а памялом з хмар сьнягі страсае. Ты павінен памагчы мне забіць яе, бо інакш саўсім лета на сьвеце ня будзе, і народ увесь вымра з голаду і холаду. Але пакуль яна ў людзкай хаце, або ў ступе сваей разьяжджае, я не магу забіць яе. Ты павінен прымусіць яе выйсьці днём белым на бязьлюдную ваду.

Прахор абяцаўся ўсё зрабіць, каб памагчы зьвясьці яе са сьвету. Завярнуў свае коні і, прыехаўшы дамоў, кажа бабе:

— Худа, бабка, нідзе ўжо ніякіх харчоў няма. Усю аколіцу пераграбстрос і ня купіў нічога. Спрабую я сазваць людзей і закінуць тонь у возеры, мо' хоць рыбы дабудзем.

Насклікаў Прахор людзей са сваей і суседніх вёсак і цэлы дзень рубалі прорубкі, пакуль не асеў лёд. Закінулі невад пад лёд, і Прахор пайшоў да бабы.

— Бабка, — кажа, — мы закінулі невад, але ня здужаем выцягнуць яго, відаць рыбы набралася поўна, ці не паможаш нам?

— А ці ня мокра там? — пытаецца баба.

— Эх, дзе там, суха! Мальцы крыху каля палонак наплюхалі, а так суха . . .

Баба туды-сюды пакруцілася па хаце, аблізалася і кажа:

— А ці ня хмарна на двары?

— Не, дзе-ж там, сама бачыш: сонца сьвеціць.

Толькі баба дайшла да сярэдзіны возера, як на небе паказалася маленькая хмарка. Калі пачалі цягнуць невад і ад яго палілася вада па лёдзе, баба, глянуўшы ўверх на хмарку, крыкнула нема і, кінуўшы невад, кінулася ўцякаць да берагу.

Ажно разарвалася хмара, і зь яе вылецеў коньнік у залатой зброі на белым кані і заступіў бабе дарогу. Коньнік быў гэткі бліскучы, што ажно на яго глядзець было нельга.

Убачыўшы коньніка, баба ськінулася ў ваграмадністую зьмяюгу, але ня здужала яна і тройчы перакуліцца, як праменны коньнік усадзіў ей у горла канец сваей дзіды. Зьмяюга скорчылася, зморшчылася і рассыпалася ў попел.

Назаўтра пасьля гэтага ўдарыла гэткае цяпло, што сьнягі ў вокавідзі патаялі, забурліла вада ў ручох і рэках, а на трэці дзень людзі ўжо выехалі ў поле з сохамі.

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011

Аб усеагульнай асьвеце і палітэхнізацыі у савецкіх школах

Дзевятнаццаты зьезд камуністычнай партыі Савецкага Саюзу вызначыў тэрміны ўвядзеньня па ўсім Савецкім Саюзе ўсеагульнай сярэдняй асьветы. Згодна пастановы зьезду неабходна: «Закончыць да канца пяцігодкі пераход ад сямігадовага навучаньня да ўсеагульнай сярэдняй асьветы (дзесяцігодка) ў сталіцах рэспублікаў, у гарадох рэспубліканскага падпарадкаваньня, у вакруговых, краёвых і буйных прамысловых цэнтрах. Прыгатаваць умовы для поўнага ажыцьцяўленьня ў наступнай пяцігодцы ўсеагульнай сярэдняй асьветы (дзесяцігодкі) ў асталых гарадох і сельскіх мясцовасьцях».

Паводля сэнсу гэтай пастановы, у наступнай пяцігодцы па ўсей савецкай краіне ня толькі ў гарадох, а і ў сельскіх мясцовасьцях усе дзеці забавязаны будуць вучыцца ў дзесяцігадовых школах, каб атрымаць ўсеагульную сярэднюю асьвету.

На жаль, гэтая пастанова пазбаўленая практычнага значэньня. Яна зьяўляецца чарговым прапагандовым сяродкам камуністычнай партыі, разьлічаным на ўвядзеньне ў памылку грамадзкасьці вольнага сьвету. Працоўныя масы Савецкага Саюзу вельмі добра ведаюць, як праводзіцца ў жыцьцё гэтак званае абавязкавае ўсеагульнае навучаньне, узаконенае яшчэ 16 кастрычніка 1918 году. У статуце аб адзінай працоўнай школе забясьпечвалася абавязкавае і дармовае навучаньне для ўсіх дзяцей школьнага веку ў школах першай і другой ступені. Бясплатнасьць і даступнасьць навучаньня гарантавалася ня толькі ў сярэдняй, а і ў вышэйшай школе савецкай канстытуцыяй у вартыкуле 121 5 сьнежаня 1936 году. Аднак канстытуцыя адно, а практыка другое. Ужо ў 1939 годзе згодна пастановы Савету Народных Камісараў СССР ува ўсіх старэйшых клясах сярэдніх школаў, тэхнікумах і вышэйшых навучальных установах была ўведзеная высокая аплата да 400 рублёў у год за права навучаньня. Гэтай пастановай даступнасьць у сярэднія й вышэйшыя школы для работнікаў і асабліва калгасьнікаў была зачыненая. Сярэдняя й вышэйшая школа сталася прывілеем дзяцей кіруючай верхавіны.

Яшчэ ў 1934 годзе сямнаццаты зьезд камуністычнай партыі канстатаваў, што задача ўвядзеньня абавязкавага чатырохгадовага навучаньня на вёсцы і сямігадовага ў гарадох разьвязаная. Праз пяць гадоў у 1939 годзе ўжо восемнаццаты зьезд камуністычнай партыі прызнаваў неабходным «завяршыць» у вёсках і ўва ўсіх нацыянальных рэспубліках усеагульнае навучаньне. Вось-жа гэтае «завяршэньне» цягнецца на працягу больш чатырнаццаці гадоў і яшчэ не закончылася. У пачатку бягучага навучальнага году Міністэрствам Народнай Асьветы БССР была праведзеная праверка ў Магілёўскай і Баранавіцкай акругах, як ажыцьцяўляецца закон аб усеагульным навучаньні. Праверка паказала надзвычайна нізкае наведваньне школ дзяцьмі ў Шклоўскім, Мсьціслаўскім, Хоцімскім, Новамыскім, Клецкім, Быценскім і ў іншых раёнах. Як адзначае маскоўская «Учительская газета» за 17 кастрычніка мінулага году, «у кажным з гэтых раёнаў не наведвае школы да ста і больш дзяцей». Няма патрэбы высьвятляць прычынаў ненаведваньня дзецьмі школаў, пакіданьня іх да заканчэньня курсу навучаньня, пашыранага другагодніцтва і непасьпяховасьці. Жахлівая непадрыхтаванасьць настаўнікаў да сваіх высокіх абавязкаў, іхнае бясправнае прыгнечанае становішча ў савецкай сыстэме, ганебны стан школьнага будаўніцтва, агульнае зьявішча бесталковага забясьпечаньня вучняў падручнікамі й пісьмовымі прыладамі, недапушчальная адсутнасьць пры сярэдніх школах так патрэбных для нармальных заняткаў габінэтаў і бібліятэкаў. Усе гэтыя «хранічныя хваробы» савецкай школы больш падрабязна асьветлены ў папярэдніх артыкулах на балонах «Бацькаўшчыны» на прыкладах з жыцьця й дзейнасьці савецкіх школаў на нашай бацькаўшчыне Беларусі.

Вось-жа з гэтых прычынаў пастанова зьезду камуністычнай партыі аб пераходзе на ўсеагульную сярэднюю асьвету на базе дзесяцігадовага навучаньня зьяўляецца чарговым прапагандовым камуністычным сяродкам. Дзеля правядзеньня ў жыцьцё сярэдняй асьветы ў наступнай пяцігодцы трэба шмат гадоў прадуманай, сур'ёзнай, плянавай працы, забясьпечваючай падрыхтоўку шматтысячных настаўніцкіх кадраў з вышэйшай асьветай, здольных для выкладаньня розных прадметаў у сярэдніх школах, затраты вялізарных матарыяльных сяродкаў, апрача савецкіх папяровых рублёў, якія патрэбныя на школьнае будаўніцтва, абсталяваньне мэбляю, габінэтамі, бібліятэкамі, дапаможнікамі і г. д. Шматлікія факты зь яскравасьцю сьветчаць, што і сямігадовае навучаньне ў савецкіх школах зьяўляецца фікцыяй. У дзень распачацьця школьных заняткаў 1 верасьня мінулага году газэта «Известия» ў перадавіцы пасьля значнай дозы «захапленьняў» аб посьпехах савецкай школы, прымушаная была прызнацца: «Ажыцьцяўленьне пераходу к сярэдняй асьвеце прадбачыць паўсямеснае і суровае правядзеньне ўсеагульнага сямігадовага навучаньня. А ці ўсюды яно зарганізаванае? Не, на жаль, ня ўсюды. У мінулым навучальным годзе ў радзе акругаў і раёнаў навучаліся ня ўсе дзеці і пераросткі; некатарая частка вучняў пакідала школу раней сямігадовага курсу. А школы, аддзелы народнай асьветы і выканкомы згаджаліся з гэтым. Папярэднія вынікі мінулага навучальнага году сьветчаць, што шмат у якіх школах пасьпяховасьць вучняў яшчэ нізкая, у радзе раёнаў навет павялічваецца лік другагоднікаў». Школы, як і іншыя дзялянкі савецкай працы, стала хварэюць, а прычына хранічнай і нявылячальнай хваробы закладзеная ў савецкай хвальшывай сыстэме. Такія вышыні, як увядзеньне ўсеагульнага сярэдняга навучаньня дзяцей школьнага веку ў вадну пяцігодку, ня могуць быць дасягнутымі. Пастанова дзевятнаццатага зьезду камуністычнай партыі мела на ўвазе толькі прапагандовую мэту і практычнага значэньня на працягу яшчэ шмат гадоў мець ня будзе.

Зьезд таксама прызнаў неабходным прыступіць да правядзеньня ў жыцьцё палітэхнічнага навучаньня ў сярэдняй школе і правесьці мерапрыемствы, неабходныя для пераходу да агульнай палітэхнічнай асьветы. Пераход школаў на палітэхнічную асьвету мае значна больш шансаў на ажыцьцяўленьне і навет у параўнальна кароткі тэрмін. Палітэхнізацыя ў савецкай школе справа ня новая. Імкненьні да палітэхнізацыі былі й раней, аднак праца ў гэтым кірунку ня прышчапілася і закончылася вырабам вучнямі простых палічак ды палачак да кветак. Паводля некаторых азнакаў сучасныя намеры палітэхнізацыі ў савецкай школе задуманыя трохі шырэй. Яна будзе праводзіцца з старэйшых клясаў дзесяцігодкі й навет сямігодкі. Савецкая ўлада надзвычайна зацікаўленая ў падрыхтоўцы кваліфікаваных работніцкіх кадраў. Работнікі патрэбныя для хвабрыкаў і заводаў, у калгасах і саўгасах, у машына-трактарных станцыях. Надзвычайна патрэбныя тэхнічныя кадры і для савецкай арміі. Для падрыхтоўкі кваліфікаваных кадраў і будзе прыстасаваная палітэхнізацыя ў старэйшых клясах сярэдніх школаў шляхам арганізацыі працы вучнямі гарадоў на розных прадпрыемствах, а ў сельскіх мясцовасьцях у майстэрнях машына-трактарных станцыяў, у калгасах і саўгасах. Такім чынам будуць дасягнутыя дзьве мэты: пасьля заканчэньня сярэдняй школы будуць выпушчаныя кваліфікаваныя работнікі, а ў часе навучаньня ў школах мільёны вучняў будуць выкарыстаныя на працы ў прадпрыемствах і ў сельскай гаспадарцы.

Падрыхтоўка да палітэхнізацыі сярэдніх школаў ужо распачатая. У сваей прамове 10 жніўня мінулага году міністар асьветы РСФСР Каіраў з націскам падчыркнуў аб неабходнасьці перагляду падручнікаў і праграмаў школаў, «бо яны перагружаныя другараднымі матарыяламі па геаграфіі, гісторыі і літаратуры. Для перагляду вызначана ўжо больш 70 школьных падручнікаў. Газэта «Правда» за 18 жніўня 1953 г. у артыкуле «На пярэдадні новага навучальнага году» таксама адзначае, што «адным з буйнейшых недахопаў у школьнай працы зьяўляецца перагрузка вучняў, што адмоўна адбіваецца на ходзе навучаньня і выхаваньня дзяцей». Савецкі друк неаднаразова адзначаў няпісьменнасьць вучняў, вельмі павярхоўнае засвойваньне ведаў роднае мовы й матэматыкі. Скарачэньне праграмы ня будзе праведзенае па матэматыцы, фізыцы, хіміі, ня будзе скарочанае і выкладаньне ў школах палітычнае схаластыкі. Затое прадбачыцца скарачэньне праграмы зь літаратуры, гісторыі, геаграфіі і іншых гуманітарных навукаў. Сярэдняя савецкая школа будзе зьліжацца да рамесьніцкае школы з абавязкавай практычнай працай у прадпрыемствах і ў сельскай гаспадарцы з узмоцненым націскам на вывучэньне матэматыкі, фізыкі й хіміі. У такім выглядзе прадбачыцца палітэхнізацыя школаў і кірунак навучаньня.

В. Б.

Няма розьніцы між СССР і царскай Расеяй

(Заканчэньне з 3-ай балоны)

цыя краю; пагарда для чалавека, ягонага жыцьця, яго правоў, як грамадзянскіх, так і прыватных; адсутнасьць свабоды думкі, сумленьня, слова, навет адсутнасьць свабоды **маўчаньня;** улада бюракрацыі і ўсемагутнасьць тайнай паліцыі; няволя Царквы; заядлы **нацыяналізм і** анэксіянізм; сьціслая кантроля артыстычнай дзейнасьці; масавыя дэпартацыі; хвараблівы недавер у дачыненьні да чужаземцаў; даношчыцтва, узвышанае да годнасьці грамадзянскага гонару; гіпакрызія, тарнаваная ў дзяржаўным маштабе — усе гэтыя зьявішчы характарыстычныя ня толькі для Расеі Мікалая ці Расеі Сталіна, але для кажнай Расеі незалежна ад гістарычнай фазы і формы ладу — мусяць быць ненавісныя для кажнай адзінкі, належачай да эўрапэйскай цывілізацыйнай супольнасьці незалежна ад таго, якія вызнае пагляды.

Пасьля зазнаямленьня з гэтай рэляцыяй зь перад звыш ста год, можна адмовіць бальшавізму ўсякай заслугі арыгінальнасьці. Адначасна трэба яму прызнаць, што зьяўляецца ўзапраўды рухам **нацыянальным,** што вырастае з самых нетраў расейскага духа.

Бальшавізм ня выдумаў амаль нічога новага. Толькі «ўдасканаліў» тое, што пераказала старадаўная традыцыя, ці, як гаворыць Кустін, «спалучыў веду Захаду з гэніем Азіі». Запрог навачасную тэхніку да адвечнага імкненьня тартураваньня людзей. Ня ў кібітках возіць вязьняў у Сібір, але ў далёкабежных цягнікох. Зьмяніў таксама **колькасьны** аспэкт традыцыйных дзеяньняў. Апэруе мільёнамі там, дзе даўней уваходзілі ў ігру тысячы. Дэпартуе цэлыя народы, там дзе прымітывізм даўнейшай тэхнікі абмяжоўваў ссылкі да адзінак і грамадаў.

Але істотна новага ёсьць мала. Сьвежы нябожчык Сталін быў толькі «папраўленым» выданьнем таго даўняга нябожчыка самадзяржцы, які, — як гаворыць Кустін — «ня толькі сам сябе абвесьціў за намесьніка Бога, але крэаваў сябе на сілу творчую — сілу навет больш далёкасяжную, чымся сіла Боская; бо-ж Бог ня можа зьмяніць мінуўшчыні, але цар можа».

Як бачым, кніга маркіза Кустіна, напісаная звыш сто год таму назад, ня толькі ў нічым ня згубіла сяньня сваей актуальнасьці, але сталася яшчэ больш актуальнай, яшчэ больш карыснай і павучальнай. Як-жа недарэчнымі ў сьвятле разважаньняў зь перад звыш ста год выглядаюць сяньняшнія довады ўсякай масьці расейскіх эміграцыйных шавіністых, што бальшавізм — гэта не Расея. Наадварот, гэта самая запраўдная нацыянальная Расея, толькі адслоненая з пад маскі ідэялізацыйнага пакосту, **які** старанна закладалі й накладаюць на яе годныя яе ейныя сыны, тая самая Расея, якую перад ста гадамі абсэрваваў францускі маркіз дэ Кустін. А гэтаму апошняму ані «сэпаратызму», ані «расчленительства», ані «предрешенства» закінуць хіба-ж нельга.

Х.

Віленчукі на сталічных сцэнах

(Заканчэньне з 8-яй балоны)

скай і сяброўства з маладым тады акторам П. Арленевам зьдзейсьнілі гэтыя мроі. Пачаўшы з аматарскіх гурткоў Васіль Швярубовіч хутка ўваходзіць і ў сур'ёзныя тэатральныя трупы і ўступае ў склад тэатру ведамага антрэпрэнэра Суворына (ён-жа й выдавец знанае расейскае газэты «Новое Время»). Ацаніўшы адразу здольнасьці Швярубовіча, Суворын вельмі быў незадаволены ягоным прозьвішчам.

— Што за Швярубовіч? Няўдалае і нягучнае. Трэба перамяніць... інакш я не магу падпісаць з вамі кантракту! — сказаў Суворын маладому актору.

Каб ня згубіць выгоднага становішча, Швярубовіч тут-жа бярэ газэту «Новы Час» і вочы ягоныя спыняюцца на аб'яве аб сьмерці нейкага Васіля Іванавіча Качалава. Дзіўнае зьявішча — ён таксама Васіль Іванавіч, быццам сам лёс дае яму і прозьвішча. Гэтак Швярубовіч робіцца Качалавам.

Слава Качалава прыйшла разам з уступленьнем у склад Маскоўскага Мастацкага тэатру (пад кіраўніцтвам гэніяльнага К. Станіслаўскага). Тут Качалаў заняў месца прэм'ера і хутка ягоны талент настолькі разьвіўся, што ён вылучыўся наагул у найбольш знаныя імёны тэатральнае сцэны. Створаныя Качалавам вобразы («Юлі Цэзар», «Бэрандзей», «Барон», «Чаўкі», «Гамлет», «Карамазаў») сталіся цэлаю эпохаю Мастацкага тэатру ды й наагул сцэнічнага мастацтва. Качалаў набывае **гістарычнае значэньне** і славу акторскую трымае да канца свайго жыцьця. Апрача таго, талент Качалава асягнуў яшчэ галіну чытаньня, дэклямаваньня. Ён задзіўляў сваім цудоўным голасам, мастацтвам мовы, шчырасьцю і глыбінёю пачуцьцяў. Як чытач-дэкляматар, Качалаў стаўся зусім своеасаблівым і арыгінальным, ня меў і, пэўна, доўга і ня будзе мець сабе роўных.

Цікавае ў Качалаве і тое, што ён увесь час, не паказваючы гэтага навонкі, адчуваў сябе Беларусам. У пашпарце Качалава пад рубрыкаю нацыянальнасьць стаяла: **Беларус.** У часе, калі ў Менску адчыніўся Беларускі Дзяржаўны Унівэрсытэт (1920 г.), Качалаў-Швярубовіч стаўся адным з заснавальнікаў студэнцкага беларускага стыпэндыяльнага фонду. Унівэрсытэт меў некалькі стыпэндыяў для бяднейшых беларускіх студэнтаў імя Васіля Качалава.

У гісторыі сусьветнае культуры й мастацтва ёсьць ці мала дзеячоў-Беларусаў ад скромных працаўнікоў да выдатных-ведамых людзей. У бальшыні творы іхныя застаюцца ў сьпіску дасягненьняў чужой пануючай культуры (ці расейскай, ці польскай, ці іншых), якая прысабечвае іх сабе. Часта мы і ня ведаем навет гэтага... Таму адшуканьне сваіх суродзічаў-Беларусаў — справа асабліва прыемная для ўсяго нашага грамадзтва. Думаецца, што нашым працаўніком у культурных галінах тут будзе справа і нацыянальнага абавязку.

М. Куліковіч

ПАПЯРЭДЖАНЬНЕ

Некаторыя кальпартэры нашай газэты й кніжак Выдавецтва «Бацькаўшчыны», ня гледзячы на неаднаразовыя нашыя просьбы й напамінаньні, ня толькі не зьвярнулі нам дагэтуль выручаных грошаў і ня толькі не правялі неабходнага з намі разьліку, але навет нічога нам на гэта не адказалі. Вось-жа папераджаем, што калі на працягу аднаго месяца гэты разьлік з намі ня будзе праведзены, мы будзем змушаныя ўжо ў нумары «Бацькаўшчыны» за 4 красавіка 1954 г. іхныя прозьвішчы падаць да публічнага ведама і перайсьці на шлях грамадзкага спагнаньня.

Гэтае-ж самае датычыць і індывідуальных падпішчыкаў «Бацькаўшчыны», якія збылі маўчаньнем нашую просьбу правесьці з намі разьлік.

Выдавецтва «Бацькаўшчыны»

УВАГА! — НОВАЯ БЕЛАРУСКАЯ КНІЖКА — УВАГА!

Выйшла з друку ў выданьні «Бацькаўшчыны» і ўжо прадаецца аповесьць ЛУКАША КАЛЮГІ

Нядоля Заблоцкіх

Кніжка выдадзеная на добрай паперы, у прыгожай вокладцы, абыймае 128 балонаў друку й каштуе 1,50 амэр. даляра або раўнавартасьць у мясцовай валюце.

Выпісваць непасрэдна з Адміністрацыі «Бацькаўшчыны» або ад нашых Прадстаўніцтваў паза Нямеччынай.

БЕЛАРУСЫ!

ВЫПІСВАЙЦЕ, ЧЫТАЙЦЕ Й ПАШЫРАЙЦЕ АДЗІНУЮ БЕЛАРУСКУЮ ТЫДНЁВУЮ ГАЗЭТУ НА ЭМІГРАЦЫІ «БАЦЬКАЎШЧЫНУ»!

АБВЕСТКА

Хлапець у веку 34 год, які жыве ў Канадзе, ажэніцца зь дзяўчынай або ўдавой у веку 25—30 год і на свой кошт пераязе ў Канаду. Зацікаўленыя просяцца пісаць на наступны адрас:

Paul Jakimczyk, 256 Chippawa St., Sarnia, Ont., Canada.

ШУКАЮЦЬ

Раганцэвіча Юльяна і **Раганцэвіча Фэлікса,** якія радзіліся ў в. Адамова Вішнеўскай вол. Валожынскага павету і выехалі ў 1918-1919 г. у ЗША ды праўдападобна пражываюць у Нью Ёрку, шукае Язэп Раганцэвіч сын Сымона. Весткі слаць на адрас: Association Bielorussa en la Argentina, c. Coronel Sayos 2981, Valentin Alsina, Buenos Aires. Argentina.

*

Дзядзьку **Канстанціна Мядзьведзя,** зь в. Асіпаўшчына, Гарадзейскай воласьці Нясьвіскага павету, які перад апошняй вайной выэміграваў у Францыю й працаваў у капальні солі ў Эльзасе-Лётарынгіі, шукае Аляксандар Грушэўскі. Весткі слаць на адрас: (13b) Rosenheim, Amselweg 14, Regierungslager. Deutschland.

Пісьмо ў Рэдакцыю

*

Брата Кіраенку Васіля, нар. 1920 г., зь вёскі Плаўнік Чашніцкага раёну, які служыў на пачатку вайны ў чырвонай арміі, шукае брат Іван. Весткі слаць на адрас:

Mr. I. Kirajenko, Rue Ferd. Nicolay 81/2 Seraing s/M. Belgique.

*

Адама Таранду зь мястэчка Ляхавічы Баранавіцкай акругі, які праўдападобна знаходзіцца ў Канадзе, шукае Пятрусь Шкляньнік. Весткі слаць на Прадстаўніцтва «Бацькаўшчыны» ў ЗША.

*

Шпакоўскую Марыю із сям'ёй, якая пражывала ў лягеры для безьдзяржаўных чужынцаў у Ляндсгуце да 1949 году, а пасьля выэміграваала ў Амэрыку, шукае Ганна Цэльлер. Весткі слаць на адрас:

Rosenheim, Äußeremünchenerstr. 7.

БЕЛАРУСЫ Ў АНГЕЛЬШЧЫНЕ!

УВАГА! УВАГА!

Стараньнямі беларускіх арганізацыяў ЗБВБ і ЦБАА, з нагоды 36-ай гадавіны абвешчаньня Незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі, у Лёндане 27-сакавіка а гадзіне 19,30, у вялікай залі Уэст Мінстэр Гол (Westminster Cathedral Hall, Ambrosden Ave, S. W. 1.), адбудзецца

КАНЦЭРТ

БЕЛАРУСКАГА СТУДЭНЦКАГА АНСАМБЛЮ ЗЬ ЛЮВЭНУ

пад кіраўніцтвам сп. сп. дыр. К. Кіслага і камп. А. Карповіча і з удзелам нашага выдатнага сьпевака баса спадара

ПЯТРА КОНЮХА.

У праграме канцэрту: народныя песьні й танцы ды песьні й музыка беларускіх кампазытараў.

Дарагія Суродзічы, не прапусьціце адзінае нагоды пачуць сваю родную песьню лювэнскага ансамблю, пабачыць багатыя беларускія народныя танцы ды паказаць гэта ўсё сваім ангельскім і іншанацыянальным сябром і знаёмым.

ЗБВБ і ЦБАА

АД РЭДАКЦЫІ

Наступны нумар «Бацькаўшчыны» выйдзе падвойным і будзе прысьвечаны 36-ай гадавіне абвешчаньня незалежнасьці Беларускай Народнай Рэспублікі.

Нашыя Прадстаўніцтвы

Ангельшчына:
Mr. Aleksander Lašuk, 97 Moore Park Road, London S. W. 6.

Бэльгія:
Zora Savionak, 19, Place Hoover, Louvain.

Данія:
J. Lobejko c/o H. C. Jensen, Leifsgade 6 III tv. Kobenhavn S.

Францыя:
Section Bielorussiene de C.F.T.C. 26, Rue de Montholon, Paris 9.
b) **Bonifacy Prytycki,** 17, rue Roger Salengro Lys les Lannoy (Nord).

Швэцыя:
Basil Lukaszyk c/o Hammer Ringvagen N. 123/III, Stockholm.

Аргентына:
Asociacion Bielorusa en la Argentina. Calle Coronel Sayos 2981, 4 de Jun.io, Prov. Buenos Aires.

Аўстралія:
Mr. Donat Jackievič, 60 Fisher St., East Brisbane, Q-ld.
b) **Mr. L. Pašynkouski,** 60 Stawell St. Burnley, Melbourne, Vic., Australia.
c) **Mr. Jan Čarneckj,** 306, Sandgate Rd., Shortland, N.S.W.
d) **Filip Dareuski, 18 Vindsor St.,** East Perth, W. A. Australia.

Бразылія:
Carlos Cimafejčyk, Prasa 76, Tiridentes, Curitiba - Parana.

Канада:
Mr. M. Racycki, 111 Lindsey Ave, Toronto, Ont.

ЗША:
a) **Mr. B. Danilovich,** 222 Suydam St. New Brunswick, N. J.
b) **Mr. M. Serdeczenko,** 7851 Sherwood Ave, Detroit 11, Mich.
c) **Mr. V. Duniec,** 2502 W. 7. St., Cleveland, Ohio.
d) **Mr. E. Budzka,** 2042 W. St. Paul Ave Chicago 47, Illinois

Новая Зэляндыя:
Mr. Marian Karanieuski, 88, Hercules Drayve, Roxburg-Hydro.

З гэтых Прадстаўніцтваў просім у пасобных краінах выпісваць «Бацькаўшчыну» й на іх адрас перасылаць за яе належнасьць.

З прычыны дэвізовых абмежаваньняў просім усіх нашых Прадстаўнікоў выручаныя за газэту грошы, як і за выдадзеныя «Бацькаўшчынай» кніжкі, перасылаць на адрас нашага фінансавага Прадстаўніка ў Бэльгіі:
Janka Žučka, 19, Place Hoover, Louvain, Belgique.

© PDF: Kamunikat.org 2011 © Інтэрнэт-версія: Kamunikat.org 2011